ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

# ДЗЕДЗІЧ

Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.
(Янка КУПАЛА)

№ 5(17)
КАСТРЫЧНІК2002

2 АДКРЫТЫ ЗВАРОТ МАЛАДЫХ АМАТАРАЎ ПІВА
5 ЖЫЦЦЁ Ў ІНТЭРНАЦЕ - ДЗЕ ТЫ?
4 БЫЦЬ АБО НЕ БЫЦЬ - ВОСЬ У ЧЫМ ПЫТАННЕ!
6 ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР: КАСТРЫЧНІК - БОЛЬ У СЭРЦЫ ЛЮДСКІМ

# ТУТ БУДЗЕ ГОРАД-САД!



У суботу, 2 лістапада, клуб "Дзедзіч" правёў чарговую экалагічную акцыю ў рамках праекта "Крок у Будучыню". На гэты раз у Берасці (скрыжаванне вул. Гаўрылава і вул. Ленінградскай) быў пасаджаны гарадскі сквер.

Акцыя пачалася а 12-й гадзіне і доўжылася каля трох гадзін. Сябры клуба, вучні СШ № 28 г. Берасця і мясцовыя жыхары пасадзілі 80 дрэваў (бяроза, рабіна) і 40 кустоў (фарзіцыя, спірэя і інш.).

Акцыя праводзілася сумесна з гарадскімі ўладамі: праект пасадкі сквера распрацавала ландшафтны архітэктар г. Берасця Наталля Мікалаеўна Балюк.

Лідэр клуба "Дзедзіч" Дзмітрый Шымански каментуе:

"Кожны чалавек робіць усё дзеля таго, каб у яго доме было прыгожа і ўтульна, таму мы і праводзім акцыі, скіраваныя на азеляненне і добраўпарадкаванне нашага агульнага дома – роднага горада.

Яшчэ адна акцыя такога кшталту плануецца намі ў будучым. Зараз мы вядзем перамовы з гарвыканкамам наконт пасадкі сквера Моладзі ў цэнтры горада".

**Алена ДЗЕМІДЗЮК**



# САМЫЙ ПОПУЛЯРНЫЙ. КТО?

В ТЕЧЕНИЕ ПРОШЕДШЕГО МЕСЯЦА В РАМКАХ ПРОЕКТА «КРОК У БУДУЧЫНЮ» КЛУБ «ДЕДИЧ» ПРОВОДИЛ ОПРОС МОЛОДЕЖИ НА ПРЕДМЕТ ВЫЯСНЕНИЯ ОТНОШЕНИЯ К ДЕЙСТВУЮЩИМ В РЕГИОНЕ МОЛОДЕЖНЫМ ОРГАНИЗАЦИЯМ. ОПРОС НЕ ПРЕТЕНДУЕТ НА ГОРДОЕ ЗВАНИЕ «СОЦИОЛОГИЧЕСКОЕ ИССЛЕДОВАНИЕ». БЫЛ СОСТАВЛЕН ВСЕГО ЛИШЬ НЕОФИЦИАЛЬНЫЙ РЕЙТИНГ ПОПУЛЯРНОСТИ МОЛОДЕЖНЫХ ОРГАНИЗАЦИЙ.

Число опрошенных – 106 человек. Из них 70% студенты ВУЗов и техникумов, 30% - школьники.

Наиболее узнаваемыми молодёжными общественными объединениями (МОО) среди респондентов, как и следовало ожидать, оказались БПСМ и БСМ (56%, 48%, /в ответах была возможность указывать несколько вариантов/). Середину списка заняли организации Зубр и Молодой Фронт (по 18% и 9% соответствено). В пределах узнаваемости находится и клуб «Дедич» (3%). Одиночные ответы респондентов пришлись на такие организации, как «Ориентир», пионеры, гайды, тимуровцы, skin head, клуб ЮНЕСКО.

**О каких МОО и мероприятиях, ими проводимых, слышали в последнее время опрошенные?** Это БПСМ (59%) -походы и объединение с БСМ, БСМ (43%), - объединение с БПСМ, пионеры (7%), «Дедич» — (3%) – очистка Мухавца.

**Зачем нужны МОО и чем они должны заниматься?** Основные группы ответов: для организации досуга молодёжи, их сплочения, организации молодёжи по интересам, для решения проблем и помощи молодёжи в трудной ситуации, для повышения интеллектуального и культурного уровня, патриотического воспитания молодёжи.

Среди опрошенных только 6% являются членами какой-либо общественной организации. Остальные привели доводы, по которым они не участвуют в общественной жизни: не хватает времени, не видят смысла, мало знают об организациях и, в конце-концов, просто не желают никуда вступать.

**И всё же, если бы респонденты вступали на данный момент в какую-либо организацию, то**

**(заканчэнне на с.2)**

## АДНЫМ РАДКОМ

### «ДЗЕДЗІЧ»: КРОЧЫМ У БУДЫЧЫНЮ

Клуб "Дзедзіч" распачаў дзейнасць па новым праекце "Крок у будучыню", які будзе рэалізоўвацца ў Берасці, а таксама ў трох бліжэйшых раёнах – Жабінкоўскім, Маларыцкім і Камянецкім.

Мэтай праекта з'яўляецца павышэнне ўзроўню грамадзянскага ўдзелу вучнёўскай і студэнцкай моладзі г. Берасця і бліжэйшых раёнаў у вырашэнні сацыяльна-значных праблем мясцовага, рэгіянальнага і нацыянальнага маштабаў.

Па некалькіх накірунках дзейнасці праводзяцца наступныя мерапрыемствы:

- акцыі па ачыстцы Мухаўца;
- экалагічныя вандроўкі;
- пасадка сквера;
- адукацыйныя семінары, віктарыны і конкурсы ў школах;
- сустрэчы моладзі Берасцейшчыны са знакамітымі беларускімі пісьменнікамі і паэтамі;
- правядзенне масавых культурніцкіх акцыяў і мерапрыемстваў у г. Берасці.

Калі Вы жадаеце ўзяць удзел у арганізацыі і правядзенні гэтых ці іншых мерапрыемстваў, тэлефануйце ў клуб «Дзедзіч».

**Dzedzich week-news**

### ЦЯПЛО НАШЫХ СЭРЦАЎ

У сярэдзіне лістапада моладзевая ініцыятыва "Гном" плануе правесці чарговую дабрачынную акцыю "Ад сэрца да сэрца". Яе мэта – інтэграцыя ў грамадства дзяцей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі і дзяцей з псіха-фізічнымі асаблівасцямі развіцця.

МІ "Гном" запрашае далучацца да акцыі іншыя моладзевыя і дзіцячыя ініцыятывы, а таксама шукае спонсараў, неабыякавых да лёсу дзяцей.

Кантакты для зваротнай сувязі:

224000 г. Берасце, б-р Касманаўтаў, 33 – 72, тэл. (0162) 23 35 67.

**Dzedzich week-news**

### НАВІНЫ МОЛАДЗЕВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ – У ЭЛЕКТРОННАЙ РАССЫЛЦЫ

Клуб "Дзедзіч" распачаў выпуск электроннай рассылкі Dzedzich week-news з навінамі жыцця моладзевых арганізацый (МА) Берасцейшчыны. Таксама ў рассылцы змяшчаецца інфармацыя аб адукацыйных праграмах, семінарах, аб'явы аб конкурсах праектаў і стыпендый і, безумоўна, крыху гумару.

Рассылка будзе штотыднёвай, але чым больш будзе навін, тым часцей яна будзе выходзіць. Просім усе МА дасылаць нам інфармацыю пра свае мерапрыемствы – былыя і плануемыя.

Калі вы ведаеце МА ў вашым рэгіёне, якія былі б зацікаўлены ў атрыманні нашай рассылкі і ў асвятленні сваёй працы на яе старонках, просім паведаміць нам іх кантакты.

Падпісацца на рассылку можа любы жадаючы. Трэба толькі даслаць ліст на адрас: dzedzich@mail.ru.

**Dzedzich week-news**

**ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!**

**Рэдакцыя "ДЗЕДЗІЧА" з задавальненнем прыме ад Вас бясплатныя прыватныя аб'явы ў наступны нумар бюлетэня, які пабачыць свет напрыканцы лістапада 2002г.**

**Звяртайцеся па тэл.: (0162) 22-90-97 да 22.11.02.**

# КРАСНЫЙ ДЕНЬ КАЛЕНДАРЯ

С ХОЛОСТОГО ВЫСТРЕЛА «АВРОРЫ» В 1917 ГОДУ В ПЕТРОГРАДЕ НАЧАЛСЯ ШТУРМ ЗИМНЕГО ДВОРЦА. ЕЩЕ 11 ЛЕТ НАЗАД ЭТОТ ДЕНЬ БУРНО ОТМЕЧАЛСЯ КАК ГОДОВЩИНА ВЕЛИКОЙ ОКТЯБРЬСКОЙ СОЦИАЛИСТИЧЕСКОЙ РЕВОЛЮЦИИ, ПОЛОЖИВШЕЙ НАЧАЛО НОВОМУ ЭТАПУ В РАЗВИТИИ ГОСУДАРСТВА РОССИЙСКОГО – СОЮЗУ СОВЕТСКИХ СОЦИАЛИСТИЧЕСКИХ РЕСПУБЛИК. НЕТ ДАВНО УЖЕ СССР, А ПРАЗДНИК БЛАГОПОЛУЧНО ПЕРЕКОЧЕВАЛ В НОВУЮ ЭПОХУ.

С вопросом «Что для вас день 7 ноября?» наш корреспондент обратился к горожанам.

**Николай Иванович,** военнослужащий в отставке, ныне преподаватель допризывной подготовки в одной из школ города:

— Трудно перестроится. Сколько себя помню, мы праздновали этот день как самый важный пра-здник. Даже Новый год не предвещал столько радости, как 7-ое ноября.

**Людмила,** индивидуальный предприниматель:

— Конечно помню, конечно праздновали. Но в победу Социалистической революции и скорый приход к коммунизму не верили никогда. Так, относились с легкой иронией. Дополнительный выходной, возможность отдохнуть.

**Владимир,** учащийся ПТУ:

— Праздник как праздник. Он скорее для более старшего поколения. С ним у меня ничего не ассоциируется.

**Зоя Владимировна,** преподаватель физики на пенсии, подсела ко мне в кафе. Поздравили с праздником:

- А вы знаете, что сегодня за праздник?

Удивилась, что я такой праздник знаю.

- Все уже забыли, что мы празднуем. Никому этот день уже и не нужен.

Праздничный мероприятия в городе в этом году закончились быстро. Потусовались, вспомнили былые времена коммунисты и по домам разошлись. В соседской России праздник отмечали масштабнее. На улицы под разными знаменами вышли представители практически всех общественно-политических движений и молодежных организаций.

**Владимир ВОРОНОВ**

# САМЫЙ ПОПУЛЯРНЫЙ. КТО?

**(Заканчэнне. Пачатак на с.1)**

**они выбрали бы:** БПСМ (12%), т.к. она более крупная, БСМ (9%) – т.к. неполитическая, Молодой Фронт, Зубр, Дедич (вместе 7%), без объяснений.

Но, несмотря на всё, 26% опрошенных ж**елают принимать участие в акциях проводимых МОО**, 12% - также примут участие, если им будет импонировать организация. Не очень положительно и частично с недоверием относятся к призывам общественных организаций 29% респондентов, безразлично – 16%.

Объединение БПСМ и БСМ поддержали и не поддержали примерно одинаковое число опрошенных (24 и 22% соответственно), с безразличием отнеслись 31% опрошеных, и 26% затруднились оценить это событие.

На вопрос **об участии в выборах** отвечали респонденты, достигшие 18 лет. Согласно данному опросу участие молодёжи в грядущих местных выборах не следует ожидать повальным. Уже решили участвовать 23%, решили не участвовать – 26%, не определились – 48% респондентов.

**Уладзімір ТАРНОЎСКІ**

**Шаноўныя сябры! Калі Вы падтрымліваеце гэты зварот да кіраўніцтва ААТ «Брэсцкае піва» - запоўніце анкету і дашліце на адрас рэдакцыі.**

# АДКРЫТЫ ЗВАРОТ МАЛАДЫХ АМАТАРАЎ ПІВА

Мы, берасцейскія аматары піва, любім прадукцыю нашага бровара і радуемся з'яўленню кожнага новага гатунку. Аднак нас засмучае, што ў афармленні Вашай прадукцыі выкарыстоўваецца выключна руская мова. Прыкра, што кіраўніцтва ААТ "Брэсцкае піва" цалкам ігнаруе дзяржаўную беларускую мову. Для многіх людзей, асабліва для моладзі, піва – адзін з любімых напояў, але нам таксама неабыякавы і стан беларускай культуры. Мы мяркуем, што прэстыж і клопат аб ёй – такая ж важная справа, як і падтрымка айчыннай прадукцыі ды яе вытворцаў. У якасці добрага прыкладу павагі да роднага можна ўзгадаць лідскі піўзавод (піва "Старажытнае", "Вітаўт" і інш.), менскія заводы "Крыніца" і "Аліварыя" (піва "Крыніца", "Партызанскае", "Бурштын Беларусі", "Алівварыя" і інш.). І гэта адна з прычын, якая робіць усё больш папулярным сярод моладзі менавіта гэтыя гатункі піва. Нас здзіўляе і крыўдзіць, што ў ААТ "Брэсцкае піва" не дбаюць пра прэстыж і папулярнасць свайго піва сярод самых адданых аматараў – беларускай моладзі.

З гэтай прычыны мы настойліва просім Вас выкарыстоўваць у афармленні прадукцыі Вашага прадпрыемства родную нам і Вам беларускую мову, а для новых гатункаў піва прапануем шукаць адметныя беларускія найменні. Спадзяемся на разуменне, падтрымку і супрацоўніцтва.

| № п/п | Прозвішча, імя і імя па бацьку | год нараджэння | адрас | подпіс |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

# БАШНЯ С ВИДОМ НА ВАРШАВУ

У ВСЕХ ЕСТЬ СВОЯ БАШНЯ. У ПАРИЖАН - ЭЙФЕЛЕВА. У МОСКВИЧЕЙ - ОСТАНКИНСКАЯ. У МИНЧАН - БЕЗЫМЯННАЯ, ТОРЧАЩАЯ ЗА ЗДАНИЕМ БТ НА ПЛОЩАДИ ПОБЕДЫ. А У БРЕСТЧАН БАШНИ НЕТ. НО ЧЕМ ОНИ ХУЖЕ ДРУГИХ?





Вобщем, брестчане решили построить себе башню. А поскольку для телетрансляции им башня не особенно нужна, ее назначением будет «обеспечение качественно нового уровня мобильной связи». Так, во всяком случае, о проекте отозвался руководитель области Василий Долголев, выступая на сессии областного Совета депутатов.

На сессии помимо депутатов присутствовали предприниматели, кои планируют внести свой вклад в постройку ретранслятора. По официальной информации, на предпринимательские плечи лягут основные расходы на постройку объекта.

Наверху башни планируется разместить ресторан, а в стволе ее – скоростной лифт. А еще обещают, что из окон ресторана можно будет лицезреть не только весь город, но и близлежащие польские деревни. Вот так-то, сходил в ресторан и вроде как за границей даже побывал.

**Николай РУЦКИЙ**

# КИНОФЕСТИВАЛЬ НАБИРАЕТ ОБОРОТЫ

В ПОСЛЕДНЮЮ НЕДЕЛЮ НОЯБРЯ В БЕЛОРУССКОЙ СТОЛИЦЕ ПРОЙДЕТ 9-Й МИНСКИЙ МЕЖДУНАРОДНЫЙ КИНОФЕСТИВАЛЬ «ЛИСТОПАД-2002».

Как сообщает РИА «Новости», в кинофоруме примут участие актеры и режиссеры из Армении, Азербайджана, Беларуси, Грузии, Латвии, Литвы, Молдовы, Украины и Эстонии. Самой представительной обещает быть делегация из России, которую на фестивале будут представлять Е.Михалков-Кончаловский («Антикиллер»), Ф.Янковский («В движении»), А.Михалков-Кончаловский («Дом дураков»), Д.Евстигнеев («Займемся любовью»), С.Рогожкин («Кукушка»), В.Тодоровский («Любовник»).



**Палац Рэспублікі, г. Менск. Фота: IREX/ProMedia**

Директор фестиваля Валентина Степанова не исключает, что минчанам посчастливится стать первыми зрителями находящейся пока в работе ленты А.Сокурова «Русский ковчег». По ее словам, во время кинофестиваля его гости проведут для студентов Академии искусств и для недавних ее выпускников серию мастер-классов.

В рамках большого «Листопада» состоится третий Международный фестиваль детского кино «Листопадик». На нем будут представлены работы кинематографистов из Беларуси и Ирана, Грузии и Франции, России и Казахстана, Китая и Чехии.

Вместе с тем, пройдут дни кино Прибалтики и стран СНГ, дни короткометражного, видео и документального кино, ретроспективный показ фильмов-лауреатов международных кинофестивалей.

Торжественное открытие кинофестиваля состоится 23 ноября во Дворце Республики Минска.

**Николай РУЦКИЙ**

## ДАРЭЧЫ

Два браты. Адзін у вайну быў паліцаем, другі – знакамітым партызанам, Героем Савецкага Саюза. Пасля вайны той, што быў паліцаем, адсядзеў прызначаны тэрмін, вярнуўся, пачаў працаваць, і ў яго пачаўся хуткі рост кар'еры. А той, што быў партызанам, як быў трактарыстам, так трактарыстам і застаўся.

І вось трактарыст пытаецца ў брата-кар'ерыста:

- Слухай, як жа так? Ты ў турме сядзеў, а так расцеш! А я? Вядомы партызан, а справы ўсё горш і горш...

- Дык у мяне ў анкеце напісана: «Брат – вядомы партызан. Герой Савецкага Саюза». А ў цябе?

***

Турыстычная група трапіла ў рукі да мясцовых абарыгенаў. Усе са злосцю косяцца на кіраўніка групы.

- Вы не хвалюйцеся, спадарства, - супакойвае той. - Яны мірныя. Дарэмна нікога есці не будуць. Жанчын згвалцяць, мужчынам пальцы паадрубаюць і адпусцяць.

- А навошта пальцы адрубаць? – цікавіцца адна дамачка.

- Што характэрна, наконт гвалту ніколі пытанняў не ўзнікае...

***

«Дарагая Марыя Іванаўна! Тэлеграму пра Ваш прыезд атрымалі. Чакаем. У астатнім усё добра. Ваш зяць».

## АДНЫМ РАДКОМ

### « ЯК РОЎНЫ РОЎНАМУ»

На базе клуба "Дзедзіч" дзейнічае цэнтр "Роўны навучае роўнага", адкрыты ў рамках праекта па стварэнні беларускай сеткі добраахвотніцкіх Цэнтраў роўнага навучання, які рэалізуе ГА "Моладзевы адукацыйны цэнтр "Фіяльта" пры падтрымцы прадстаўніцтва Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЭФ) у Беларусі. Цэнтр роўнага навучання працуе па праграме ВІЧ/СНІД, прапагандзе здаровага ладу жыцця. Навучанне праходзіць у форме адукацыйных семінараў з элементамі гульняў, працягласць – ад 1 гадзіны да 3 гадзін. Семінар можна замовіць для любой навучальнай установы Берасця па тэл. (0162) 22-90-97 (Алена Кірычук).

**Dzedzich week-news**

### "ПРЭС-БУМЕРАНГ" ГЛЯДЗІЦЬ НАПЕРАД

Пасля летняга перапынку зноў распачаў дзейнасць прэс-клуб "Прэс-бумеранг" (г. Кобрын). Расказвае лідэр клуба Юлія Камарова: "Не вытрымаўшы, юныя сябры зноў заняліся любімай справай у сценах напаўразбуранага цэнтра "Гармонія".

Мала таго, што дзеці працягнулі добрую традыцыю выпуску газеты "Прэс-бумеранг", дык яшчэ і арганізавалася другая група карэспандэнтаў-навічкоў. Адсутнасць у цэнтры цяпла і вады моладзь не пужае. Аб'яднаныя агульнай ідэяй, яны з аптымізмам глядзяць у будучае!". А 27-29 верасня моладзевы цэнтр наладзіў агульнагарадскую акцыю «Падаруй гораду кнігу». Жыхары горада і раёна прынеслі любыя кнігі, часопісы, энцыклапедыі і даведнікі на вызначаныя кропкі збору. 29 верасня адбылося падвядзенне вынікаў акцыі. Гледачоў чакала выступленне арганізатараў, ганаровая перадача кніг бібліятэцы і канцэртная праграма.

**Dzedzich week-news**

### КОЖНАЙ ВЁСЦЫ – ПА МОЛАДЗЕВАЙ ІНІЦЫЯТЫВЕ!

Сёння мы прадстаўляем Вашай увазе моладзевую ініцыятыву, інфармацыя пра якую ніколі раней не змяшчалася ў нашай газеце.

Моладзевую ініцыятыву "Кажан" складае моладзь вёскі Кажан-Гарадок (Лунінецкі р-н). Па словах Віталя Каратыша, лідэра "Кажана", ініцыятыва носіць патрыятычны характар і існуе ўжо два гады. МІ мае тры асноўныя накірункі: ахова навакольнага асяроддзя; захаванне гістарычнай спадчыны; павышэнне культурнага ўзроўню моладзі. Сябры ініцыятывы ўжо склалі свой статут і ў бліжэйшым будучым плануюць падаць дакументы на рэгістрацыю.

За час свайго існавання МІ "Кажан" правяла шэраг культурна-гістарычных і экалагічных акцый. Так сябры ініцыятывы своеасаблівым чынам адзначылі Каляды (13 – 14 студзеня 2002 г.). Пераапранутая калядоўшчыкамі моладзь збірала старадаўнія беларускія звычаі, абрады, павер'і і г. д.

8 - 9 жніўня 2002 г. з ініцыятывы МІ сумесна з ЗБС быў наладжаны летнік, што меў назву "Палеская рабінзоны". Каля 25 чалавек правялі два дні на беразе Прыпяці. Мэтай летніку было павышэнне навыкаў працы ў камандзе шляхам гульняў, якія моладзь распрацавала сама. Уменне паводзіць сябе на прыродзе, заўважаць прыгажосць родных мясцінаў і берагчы яе, - вось чаго не хапае сёння ўсім нам.

А цяпер пра планы на будучае. Сябры "Кажана" плануюць зладзіць наступныя Каляды на кшталт мінулых і запрасіць на іх сяброў з Чэхіі. На жаль, пакуль у ажыццяўленні гэтай задумы існуюць пэўныя фінансавыя цяжкасці, але мы шчыра спадзяемся, што мара моладзі спраўдзіцца.

**Dzedzich week-news**

# ДИЛЕММА ЖИЗНИ


Фото: В.Чеберкус

ПОД ШУМ ЛЬЮЩЕЙСЯ В ВАННУ ВОДЫ ЧЕЛОВЕК НЕТОРОПЛИВЫМ ДВИЖЕНИЕМ ОТКРЫЛ ОПАСНУЮ БРИТВУ И НЕСКОЛЬКО РАЗ ПОЛОСНУЛ ПОПЕРЕК ЗАПЯСТЬЯ. КРОВЬ ДЫМНЫМ ОБЛАКОМ ОБАГРИЛА РЖАВУЮ ВОДУ.

У входной двери в этот мир у человека никто не спрашивает, хочет он зайти или нет. Его просто выталкивают в заботливые руки акушерки, и начинается жизнь. Неоспоримым, но осуждаемым большинством конфессий, правом человека является право решать, когда свести счеты с неполюбившейся стервой-жизнью.

Что касается истории, то самые древние сведения о самоубийствах мы можем найти в мифах. Фантазия древних китайцев, японцев, египтян, армян до сих пор поражает наше воображение. Например, в армянских легендах души самоубийц превращались в зооморфных существ, выступающих в виде кошек, собак, волов, ослов, которые стояли у дорог и пугали прохожих. Наши предки рисовали мир населенным страшными чудовищами, во власти которых находился человек. Чтобы не разгневать сильнейших, люди должны были жертвовать самым ценным: добычей, украшениями, пищей и даже жизнью.

В Древнем Китае и Японии широкое распространение получили ритуальные самоубийства. Тем самым люди рассчитывали на благосклонность многочисленных богов. Самоубийство было возведено в ранг искусства наравне с живописью и стихосложением. Этому обучали с раннего детства. Посмотреть на самоубийство собиралась толпа людей. Никому из присутствующих не приходило в голову прервать самоубийцу.

До совершенства технику самоубийства довели японцы варварскими способами харакири и откусыванием языка. Характерно, что из жизни уходили с чувством гордости.

Широко распространенным было самоубийство из-за любви. Двое влюбленных непосредственно перед смертью втайне ото всех посещали красивейшие места Японии. Выбрав самое романтическое и оставив предсмертное письмо, в котором винили в своей смерти исключительно себя, влюбленные добавляли в пищу яд. Нередко мужчина сначала убивал свою возлюбленную, а потом перерезал горло и себе. Погибших хоронили вместе: по поверью в загробной жизни они будут неразлучны. До сегодняшнего дня в Японии в наиболее популярных для самоубийства местах стоят посты полиции.

После смерти мужа индийская женщина не могла снова выйти замуж. Ей запрещалось носить украшения, пользоваться косметикой, есть мясо. До конца своих дней она жила в семье покойного супруга. Смерть на костре казалась вдовам не самым тяжким испытанием. Церемония проводов вдов на смерть зависела от материального и общественного положения семьи. Если денег и знатности было недостаточно, то женщину закапывали живьем вместе с покойным мужем, другие топились, третьи морили себя голодом, четвертые вешались. Об этом надо было загодя оповещать друзей и родных.

**Марина ТАЛЬЧУК**

# «ЖАЛЬ, НЕТ РУЖЬЯ» У «КОРОЛЯ И ШУТА»

НАКОНЕЦ, ХОЧЕТСЯ ОБРАДОВАТЬ И ПОКЛОННИКОВ РОК-ГРУППЫ «КОРОЛЬ И ШУТ» - 10 ОКТЯБРЯ ВЫШЕЛ НОВЫЙ ДОЛГОЖДАННЫЙ АЛЬБОМ «ЖАЛЬ, НЕТ РУЖЬЯ»!

В больше чем годовую работу вошло 17 новых песен, среди которых есть старые композиции “Короля и Шута”, написанные одним из лидеров группы Андреем Князевым (на фото) в юности, а также сочиненные лишь недавно произведения.

Работа получилась достаточно концептуальной – у каждой песни своя прелюдия-повествование в стихах:

— Мы давно уже хотели создать альбом, который состоял бы из одной большой истории, где сами бы выступали в качестве рассказчиков: монологи, диалоги и все дела, – сказал Князь.



Тех, кто решит купить данную запись на CD, ждет сюрприз – его обратная сторона абсолютно черная.

И, как всегда в таких случаях, не забывайте: на всех фирменных дисках и кассетах должна быть голограмма Westrecords - эксклюзивный дистрибьютор диска на территории Республики Беларусь.

**Николай РУЦКИЙ**



# РЫЦАРСКІ ФЭСТ Ў ЗАСЛАЎЛІ. А ЦІ ПАТРЭБНА?

У ПАЧАТКУ ВЕРАСНЯ Ў МЯСТЭЧКУ ЗАСЛАЎЛЬ АДБЫЎСЯ ФЕСТЫВАЛЬ СЯРЭДНЯВЕЧНАЙ КУЛЬТУРЫ І ТРАДЫЦЫЙ – “ЗАСЛАЎСКІ НАБАТ 2002”.

Па ліку ўжо другі. А арганізаваны ён быў Канфедэрацыяй рыцарскіх груповак «Рыцары Вялікага Княства» і кіраўнікамі клубаў «Княжы Гуф» (г. Менск), «Дайнава» (г. Ліда), «Жалезны воўк» (г. Полацк), «Берасцейская харугва» (г. Берасце), «Рыцарскае кап’ё» (г. Радужны).

Нягледзячы на такую колькасць арганізатараў і памочнікаў, былі там і свае праблемы і недарэчнасці, але ж у гэтым выпадку не выканалі свае абавязкі гаспадары горада.

Як стала вядома з размовы з кіраўніком Канфедэрацыі рыцарскіх груповак «Рыцары Вялікага Княства» і адначасова кіраўніком клубу «Княжы Гуф» Фёдарам Міхеевым, з запланаваных на гэты фэст мерапрыемстваў была, «як належна», выканана толькі трэцяя частка. І не таму, што рыцары не зрабілі сваю справу: бугурты, турніры, спаборніцтвы дружын і, галоўнае дзейства — рэканструкцыя бітвы і аблогі Заслаўскага замка 1434 года, а таму, што гаспадары не змаглі зрабіць амль нічога ў плане арганізацыі свята.



Вось зараз і вырашаюць арганізатары фэсту: ці варта гэта рабіць і каму гэта сапраўды, акрамя рыцарства, трэба.

А гэта сапраўды трэба! Трэба не толькі нам, а нашым дзецям і ўнукам. Таму што рыцары – гэта не толькі бойкі, асады і фэсты, гэта нашая культура, нашыя традыцыі, нашае жыццё.

**Мікалай РУЦКІ.**

# ЕСТЬ ЛИ ЖИЗНЬ В ОБЩАГЕ?..

ЭТОТ ВОПРОС ИНТЕРЕСУЕТ НЕ ТОЛЬКО САМИХ СТУДЕНТОВ, НО И ЗАБОТЛИВЫХ РОДИТЕЛЕЙ, ДАЖЕ НЕ ПОДОЗРЕВАЮЩИХ О ТОМ, КУДА ОНИ ОТПРАВИЛИ И НА ЧТО ОБРЕКЛИ СВОИХ ГОРЯЧО ЛЮБИМЫХ ЧАД. ОТВЕТИТЬ НА НЕГО Я ПОПЫТАЛАСЬ С ПОМОЩЬЮ НЕБОЛЬШИХ ЗАРИСОВОК ИЗ ЖИЗНИ ОБИТАТЕЛЕЙ ОБЩАГИ.

**СВОИ И ЧУЖИЕ.**

В общаге так заведено: коль уж у кого-нибудь случается День варенья, то непременно это мероприятие должно перерасти в “небольшой” праздник души. А какой праздник обходится ХОТЯ БЫ без пива?! Так вот, вся соль в том, чтобы каменда (т. е. комендат – прим. автора) или воспитка (по анологии с первым) не застукала этих самых «любителей» с поличным. Конечно, можно было бы обойтись парочкой добровольцев, постоять на «шухере», однако кому захочется пропускать это мероприятие хотя бы частично. Когда все в сборе и маленькая комнатушка заполнена до отказа, двери закрываются изнутри. Праздник идет своим чередом, никто ни о чем не беспокоится, и все потому, что существует своя система распознавания: если в комнату стучится разъяренная каменда (см. выше), то тут и ежу понятно, как она это делает – она со всей своей камендовской мочи барабанит в дверь кулаком. Разумеется, вся стеклотарища рассовывается по углам и, когда распахивается дверь, каменда видит лишь огромное удовольствие и умиление на лицах студентов. Если же на День варенья опаздывает один из приглашенных, то легким постукиванием кончиков пальцев он призывает всех собравшихся пустить его на праздник души. Да, тут уже ничего не поделаешь, оказывается, не так уж и глуп наш белорусский студент.


Фото: IREX/ProMedia

**ЧТО У НАС ЕСТЬ….**

Жизнь, как проявление движения, появляется в общаге так же внезапно, как и исчезает. К 21.00 студенты просыпаются, если они пытались самозабвенно позабыть о предстоящем зачете или экзамене. Кто-то только что закончил выяснять отношения с холодильником, пытаясь найти ответ на вечно мучающий студентов вопрос: “Какая «зверушка» сожрала …?!” Все вокруг чего-то ищут, чем-то интересуются, ходят (таскаются, ползают и т. д.) друг к другу в гости. Кстати, о гостях. В общаге существует такая примета: если к вам в комнату пришли три- четыре студента (преимущественно мужского пола и безо всякой причины) - это значит, что их “попросил” удалиться более “изобретательный” сосед, приведший в свои апартаменты даму сердца и не желающий ее ни с кем делить. Вывод: этот вечер Казанова проведет, решая демографическую проблему нашей страны, а менее удачливые студенты будут вас развлекать, лишь бы не оказаться на коридоре.

А что же такого ужасного в этом самом коридоре? Все начинается, когда ничего не подозревающие студенты “культурно” проводят свое свободное время. К 5 часам утра, когда общага замолкает и будильник на тумбочке, как и его хозяин, тихо посапывает, приходит он! Сначала доносятся слабые вопли и стоны, затем звук нарастает, и уже можно разобрать в этом крике слова мольбы о помощи. Все, кто его видели (еще бы, я тоже проснулась бы от такого шухера), приходят, как впрочем и уходят, в ужас: на вид ему лет тридцать, волосы дыбом, глаза стеклянные, на голове платок, завязанный по-арабски – в общем типичный наркот. Он бегает по коридорам, стучит в двери и умоляет о помощи. Капли холодного пота и последняя замученная мурашка на спине говорят о неописуемом страхе и ужасе, который наводит этот странного происхождения тип на всю общагу. Кто же он? В ходе расследования особо любопытным студентам удалось выяснить, что этот ночной визитер - ни кто иной, как обыкновенный кореш, зашедший в гости к своим дружбанам со спортфака.

**ВОТ ТАК И ЖИВЕМ…**

Неотъемлемую часть жизни в общаге составляют вечерние игрища. Из разных концов общаги доносятся звуки гитары и взволнованные песнями голоса (а вот “кошечек мучить”, наверное, не стоило бы). То там, то тут, если заглянуть в отдельные комнаты, можно стать свидетелем весьма забавного процесса: любопытной игры в карты на раздевание. А вот ее правила: а впрочем, не стоит…. Просто этот процесс способствует поддержанию нормальной физической формы студентов. Хотя есть и другие не менее интересные занятия…

Начало недели ознаменовано у обитателей общаги прелестным и очень приятным процессом – приемом пищи в БОЛЬШИХ количествах. Из теплых, уютных домашних гнездышек “прилетают” студенты, которые с радостью кормят всех окружающих, т. к. существует неписаный закон: “Если у кого-то что-то есть сегодня, то завтра у него этого может и не быть”. Отсюда ВЫВОД: поделись с ближним своим. Однако к концу трудовых будней студенты затягивают пояса потуже, и, если вы загляните в общагу ближе к выходным, то вас удивит большое количество блуждающих в поисках пищи.

Вот так и живут студенты от субботы до субботы,от банки пива до икоты.

**Мария ЕСИНА.**

# У БЕРАСЦІ СНІД НЕ ПРОЙДЗЕ!

ПАЧЫНАЮЧЫ З МІНУЛАГА МЕСЯЦА, У РАМКАХ ПРАГРАМЫ “РОЎНЫ НАВУЧАЕ РОЎНАГА” КЛУБ «ДЗЕДЗІЧ» ПРАВОДЗІЦЬ У НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ ГОРАДА СЕМІНАРЫ ПА ПРАБЛЕМЕ ЗДАРОВАГА ЛАДУ ЖЫЦЦЯ.

Яны прысвечаныя метадам прафілактыкі ВІЧ/СНІД. Згадзіцеся, для Беларусі тэма вострая і актуальная: на 1-га верасня 2002 года ў рэспубліцы зарэгістравана каля 4,5 тыс. ВІЧ-інфіцыраваных. 85% з іх маладыя людзі ва ўзросце ад 15 да 29 гадоў. Гэты сумны факт не можа заставацца па-за ўвагай грамадства, а асабліва маладзевых арганізацый, што дбаюць пра будучае сваёй краіны.

Асноўная мэта семінараў – расказаць вучням пра хваробу, навучыць, як уберагчы сябе ад ВІЧ-інфекцыі. На адным з такіх семінараў у якасці назіральніка прысутнічаў і наш карэспандэнт.

На гэты раз семінар праводзіўся з вучнямі восьмага класа СШ № 35 г. Берасця. Неверагодна, але пераважная большасць падлеткаў не ведала пра ВІЧ/СНІД нічога дакладнага.

У даволі цёплай працоўнай атмасферы шкаляры вучыліся, як правільна сябе паводзіць, каб не набыць ВІЧ. У практычнай часцы семінара трэнеры паказалі дзецям презервативы і расказалі пра пра-вілы іх набыцця, захавання і выкарыстання. Цікава было паглядзець на ўжо не маленькіх хлопцаў і дзяўчат, што адскоквалі ад гэтага гігіенічнага сродку, як ад змяі. Склалася ўражанне, што з ім у большасці прысутных асацыіруецца нешта вельмі дрэннае і бруднае.

**Алесь ГЕРМАНОЎСКІ**

## ДАРЭЧЫ

- Нешта тваёй сяброўкі не бачна, пасварыліся?
- Так. У яе такі страшны смех, які мяне ўжо дастаў.
- Дзіўна, ніхто ў нашай кампаніі гэтага не заўважаў.
- А я ў кампаніі ніколі і не распранаўся...

***

Шлюбная ноч. Маладая зусім ненасычаная. Адзін раз, другі, трэці, шосты...

Раніцай жонка пачынае драмаць, а муж, хістаючыся, ідзе ў туалет. Пяць хвілін яго няма, пятнаццаць!

Жонка прачынаецца і ідзе яго шукаць. Заходзіць у туалет і бачыць, як той шарыць у майтках і шэпча:

- Ну давай! Вылазь! Я табе жалезна кажу - яна спіць...

Культура
*Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі! (Ф. Багушэвіч)*

**ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР**

# КАСТРЫЧНІК –

## 4 КАСТРЫЧНІКА

У гэты дзень, 4 кастрычніка 1535 года з друку выйшла першая ў свеце **Біблія** на ангельскай мове. Вартая ўвагі акалічнасць. Беларусы, дзякуючы Францішку Скарыне, атрымалі сваю Біблію па-беларуску ў 1517 годзе, то бок амаль на дваццаць гадоў раней за ангельцаў. Згадзіцеся, ёсць чым ганарыцца.

4 кастрычніка 1980 года ў аўтамабільнай катастрофе загінуў **Пётр Машэраў**, колішні першы сакратар Кампартыі Беларусі, герой Савецкага Саюза. Менавіта з ягонай асобаю звязваюць і кепскае, і добрае, што рабілася ў Беларусі за часамі застою. І да сёння для многіх Машэраў з’яўляецца ўвасабленнем добрага начальніка. Ці не таму адразу пасля ягонай смерці з’явілася шмат міфаў вакол той аўтакатастрофы. Маўляў, гэта Брэжнеў ці КДБ падстроілі. Блыталіся і дэталі. Адныя кажуць, што яго заваліла бульбаю з трактара, другія – што нібыта была яшчэ адна нейкая машына. Але, у кожным разе, разам з Машэравым сышла яшчэ адна эпоха ў гісторыі Беларусі. Добрая ці дрэнная яна была, гісторыя рассудзіць.

## 8 КАСТРЫЧНІКА

8 кастрычніка 1917 года выйшаў у свет першы нумар газеты **“Беларуская Крыніца“**. Гэтаму выданню беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў было наканавана адносна доўгае жыццё, а таксама ўнікальная роля ў развіцці нацыянальнай ідэі і культуры. Пачала “Беларуская Крыніца“ выходзіць у Петраградзе, пасля адзін нумар яе выйшаў у Менску (1918г.), а ўся наступная гісторыя выдання звязаная з Вільняй. Спыніла газета свой выхад улетку 1940-га, калі амаль усе віленскія беларускія дзеячы былі адпраўленыя на расстрэл або ў ГУЛАГ.

## 9 КАСТРЫЧНІКА

9 кастрычніка 1596 года ў Берасці была абвешчаная **царкоўная унія**. Праваслаўная і каталіцкая цэрквы на Беларусі вырашылі аб“яднацца. Праваслаўная царква, захоўваючы сваю іерархію, прызнавала вяршыньства Папы Рымскага і каталіцкую дагматыку. Такім чынам, яна ператваралася ў грэка-каталіцкую, або уніяцкую. Пры гэтым новая царква захавала ўсе праваслаўныя абрады, а багаслужэнні і казанні адбываліся па-беларуску. Натуральна, што такое глабальнае ў маштабах усёй краіны аб“яднанне не магло не выклікаць асобныя пратэсты. Але ў цэлым гэта быў прагрэсіўны крок, скіраваны на кансалідацыю беларускай дзяржавы і яе насельніцтва. Нездарма ж народ пазітыўна ўспрыняў уніяцтва як сваё, і ў XVIII ст. ужо 75 працэнтаў жыхароў Беларусі былі уніятамі. Але жорстка негатыўна паставілася да яго Масква, бо Унія набліжала беларусаў да Еўропы і касавала прэтэнзіі Масквы быць трэцім рымам на нашых землях. Таму пасля акупацыі беларускіх земляў імперскай Расеяй напрыканцы XVIII ст. акупанты адразу ж пачалі пераганяць народ з уніяцтва ў праваслаўе. Між тым, уніяцкая беларуская царква існуе да нашага часу як найбольш беларуская ў параўнанні з “расейскім” праваслаўем і “польскім” каталіцтвам. Варта нагадаць, што адраджэнне Уніі ставіў адной з задачаў паўстання 1863 – 1864 гг. на землях Беларусі Кастусь Каліноўскі, які называў уніяцтва вераю нашых дзядоў.

Сёння ўвесь свет адзначае вялікае мноства ўсялякіх святаў. Напрыклад, Сусветны дзень пошты і Міжнародны дзень супраць стыхійных бедстваў; у ЗША святкуюць Дзень фермера (аказваецца, і ў Амерыцы бывае так, і мы з нашым Днём работніка сельскай гаспадаркі зусім не выключэнне); Гаваі адзначаюць Дзень свайго адкрыцця, а Ганконг – дзень нараджэння Канфуцыя; Перу святкуе дзень нацыянальнай годнасці (вось бы і ў Беларусі такое свята), а Паўднёвая Карэя – Дзень карэйскага алфавіта. Вось такі святочны дзень.

## 10 КАСТРЫЧНІКА

10 кастрычніка 1796 года на Магілёўшчыне нарадзіўся **Міхаіл Без-Карніловіч**, якому наканавана было стаць знакавай фігурай у беларускай гістарычнай навуцы. Ягоная кніга “Гістарычныя звесткі пра знакамітыя месцы ў Беларусі“ пабачыла свет у 1855 годзе, і з тых часоў яе можна было чытаць толькі ў спецыялізаваных аддзелах бібліятэк. Без-Карніловіч падаваў падзеі беларускай гісторыі такім чынам, як яны адбываліся ў рэальнасці, не перакручваў іх і не замоўчваў. А гэта супярэчыла спачатку афіцыёзнай расейскай імперскай, а пасля савецкай ідэалогіі. У пачатку 90-х гадоў раздзелы з кнігі Без-Карніловіча перадрукоўвала папулярная апазіцыйная газета “Свабода“. І для публікі яны сталі сапраўдным адкрыццём.

10 кастрычніка 1939 года Савецкі Саюз перадаў **Вільню** Літве. Перад гэтым меркавалася зрабіць яе сталіцай Заходняй Беларусі. Па горадзе былі развешаны плакаты па-беларуску пра тое, што Вільня стала савецкай навечна, пачала выдавацца газета “Віленская праўда“. Але “вечнасць” доўжылася каля трох тыдняў - 10 кастрычніка была падпісаная дамова пра ўзаемную дапамогу паміж СССР і Літвою. Паводле гэтай дамовы Вільня і Віленшчына адыходзілі да Літвы, а СССР за гэта атрымаў магчымасць размяшчаць на тэрыторыі Літвы (у Велейцы, Алітусе, Прэнай ды іншых месцах) свае вайсковыя базы, а таксама карыстацца ўсімі аэрадромамі для сваёй авіяцыі. Такім чынам, доўгая мара літоўцаў пра Вільню была спраўджаная. Пройдзе яшчэ крыху часу, і СССР праглыне Літву, ператварыўшы яе ў адну з савецкіх рэспублік.

## 12 КАСТРЫЧНІКА

12 кастрычніка 1925 года ў Берліне пачалася II **Усебеларуская канферэнцыя**. Тыя беларускія палітыкі, якія вырашылі, што ў савецкім Менску можна па-сапраўднаму рэалізаваць нацыянальныя ідэалы беларускага адраджэння, пераконвалі эмігрантаў, каб тыя з гэтым пагадзіліся і не вялі змагання з бальшавікамі. На канферэнцыі нібыта паўнамоцтвы ўраду БНР былі перададзеныя ўраду БССР. Праўда, старшыня Рады БНР Пётр Крэчэўскі і ягоны намеснік Васіль Захарка гэтага рашэння не прызналі. Як паказала гісторыя, слушна зрабілі. Бо нацыянальнае адраджэнне ў Менску хутка змянілася жорсткай русіфікацыяй і патанула ў крывавай хвалі сталінскіх рэпрэсіяў. Тым часам урад БНР працягваў існаваць на эміграцыі, перахоўваючы ў чысціні нацыянальную беларускую ідэю. Сёння гэтую справу працягвае Рада БНР на чале з Івонкай Сурвілай.

## 13 КАСТРЫЧНІКА

13 кастрычніка 1888 года ў засценку Пунькі, што на Дзісеншчыне, нарадзіўся геніяльны беларускі мастак **Язэп Драздовіч**. Вучыўся ён у Вільні, у мастацкай школе. А пасля і сам стаў ініцыятарам і заснавальнікам мастацкай студыі пры Віленскай беларускай гімназіі. Язэп Драздовіч – чалавек незвычайны, з неардынарнымі здольнасцямі. ¨н быў шматгранным творцам – жывапісцам, графікам, скульптарам, разбяром па дрэве, пісьменнікам, паэтам, этнографам, фалькларыстам, астраномам.

Пасля І Сусветнай вайны быў мастацкім рэдактарам першага ў савецкай Беларусі лемантара, у Германавічах арганізаваў асветнае таварыства “Заранка”, а ў вёсцы Сталіца – школу з навучаннем на роднай мове па сваёй метадыцы. Драздовіч пешшу абышоў усю Заходнюю Беларусь, замалёўваючы легендарныя курганы і рэшткі велічных замкаў, яму належыць гістарычны раман “Гарадольская пушча”. Цікава, што Язэп Драздовіч быў пачынальнікам касмічнай тэмы ў беларускім выяўленчым мастацтве. Праз усё жыццё пранёс ён вялікую прагу да спазнання Сусвету, шчыра веруючы ў тое, што і на іншых планетах існуе жыццё. Драздовіч – аўтар кнігі “Нябесныя бегі”, у якой выклаў сваю тэорыю будовы Космасу.



Арыгінальнае ўяўленне і багатая фантазія Драздовіча дазволілі яму зазірнуць у далёкі і невядомы, загадкавы і таямнічы свет, па-майстэрску выкласці сваё бачанне структуры і формы пазазямнога жыцця.

## 14 КАСТРЫЧНІКА

14 кастрычніка 1899 года ў в. Слабада-Кучынка, што на Капыльшчыне, нарадзіўся **Адам Бабарэка**, выдатны беларускі літаратар ды крытык. Скончыў ён Менскую духоўную семінарыю, а затым Беларускі універсітэт, там жа выкладаў пазней беларускую мову і літаратуру. Адам Бабарэка быў адным з самых актыўных арганізатараў і дзеячоў літаратурных аб’яднанняў, спачатку “Маладняка”, а затым і “Узвышша”. Ягоныя мастацкія рэчы былі ўвасабленнем маладнякоўскіх эцюдаў. А вось як тэарэтык-крытык ён распрацаваў цікавую ўласную сістэму, у якой першым даў эстэтычныя ацэнкі творчасці класікаў нацыянальнай літаратуры. Лёс літаратара склаўся традыцыйна: ён быў арыштаваны, сасланы і загінў на высылцы ў Расеі, усё ў тым жа 38-м...

## 15 КАСТРЫЧНІКА

Пад гэтым днём у нашым календары пазначаныя дзве смутныя даты. Абедзве звязаныя паміж сабой тым, што з’яўляюцца днямі смерці выдатных дзеячоў паўстання 1794 года супраць расейскага панавання.

15 кастрычніка1817 года на чужыне, у Швейцарыі, памёр **Тадэвуш Касцюшка.** Нарадзіўся ён на Берасцейшчыне ў сям“і беларускага шляхціча. У 1769 годзе скончыў Варшаўскі кадэцкі корпус. Затым пяць гадоў вучыўся ў Парыжскай ваеннай акадэміі. У1776 годзе ён паехаў у Паўночную Амерыку, дзе пачалася вайна за незалежнасць. Тут ён атрымаў званне генерала і быў узнагароджаны самым высокім ордэнам Злучаных Штатаў - ордэнам Цынцынаці. Вяр-



# БОЛЬ У СЭРЦЫ ЛЮДСКІМ

нуўшыся на радзіму, Касцюшка ачоліў паўстанне супраць расейскіх ды прускіх акупантаў, што выбухнула ў сакавіку 1794 года. Напачатку яно мела некаторы поспех, але пасля таго, як Расея і Прусія накіравалі супраць паўстанцаў вялікую колькасць войскаў, паўстанне было зламана і задушана. Касцюшка, цяжка паранены ў бітве каля Мацяёвіцаў, быў узяты ў палон і зняволены ў Петрапаўлаўскай крэпасці ў Пецярбурзе. Пасля смерці царыцы Кацярыны II яе сын Павел I вызваліў Касцюшку і дазволіў яму выехаць за мяжу, дзе той і памёр 15 кастрычніка 1817 года.

У гэты ж дзень 1824 года, таксама на чужыне, памёр паплечнік Тадэвуша Касцюшкі **Рамуальд Гедройц**, адзін з самых вядомых камандзіраў паўстання 1794 года. ¨н нарадзіўся ў 1750 годзе ў вёсцы Бабчын, што на Браслаўшчыне. Ад 19 гадоў стаў вайсковым дзеячом, браў чынны ўдзел у баявых дзеяннях Барскай канфедэрацыі, удзельнічаў у дзесятках бітваў. З 1778 года Рамуальд Гедройц быў намеснікам каменданта брыгады гусараў Вялікага Княства, абіраўся паслом на Гарадзенскі сойм 1784 года. Пасля задушэння паўстання на тэрыторыі Беларусі Гедройц адышоў у Польшчу са сваім пяцітысячным атрадам, дзе прыняў удзел у абароне Варшавы ад расейскіх войскаў Суворава. Калі і польская сталіца была захопленая, паранены Рамуальд Гедройц змушаны быў эміграваць. Там ён і памёр, больш не ўбачыўшы сваёй Бацькаўшчыны, за якую больш як 20 гадоў праліваў кроў, ад Гародні да Сталавічаў.

## 17 КАСТРЫЧНІКА

17 кастрычніка 1588 года ўведзены ў дзеянне **Статут Вялікага Княства Літоўскага**. Часам гісторыкі называюць яго першай еўрапейскай канстытуцыяй. Гэты кодэкс права на працягу 250 гадоў быў дзейным законам на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Украіны і складаў аснову ўсёй прававой сістэмы Вялікага Княства Літоўскага. Гэта значыць, сапраўды быў асноўным законам, канстытуцыяй краіны. Складаецца Статут з 488 артыкулаў, якія змяшчаюцца ў 14 раздзелах. ¨н усталёўваў адказнасць шляхты за забойства паспалітага чалавека, абвяшчаў ідэю верацярпімасці, забараняў перадачу вольнага чалавека за даўгі або злачынствы ў няволю. Надрукаваны Статут быў на старабеларускай мове ў віленскай друкарні Мамонічаў, а прадмову да яго напісаў сам канцлер Вялікага Княства Леў Сапега. ¨н таксама з'яўляўся і адным са складальнікаў Статута.

## 21 КАСТРЫЧНІКА

21 кастрычніка 1919 года ў Менску, тады яшчэ не савецкім, пачала выходзіць газета **"Беларусь"**. Яна працягвала традыцыі "Нашай Нівы", імкнулася згуртаваць беларускія партыі і рухі вакол ідэі незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі. На яе старонках друкаваліся лепшыя, тады яшчэ маладыя беларускія літаратры і навукоўцы Янка Купала, Якуб Колас, Максім Гарэцкі, Францішак Аляхновіч, Уладзіслаў Галубок ды іншыя. Газэта "Беларусь" пісала пра неабходнасць стварэння беларускага войска, беларускай школы, беларускай гаспадаркі. Адным словам, пра ўсё тое, пра што і сёння пішуць незалежныя беларускія выданні. На жаль, газета спыніла сваё існаваньне ў сувязі з бальшавіцкай акупацыяй Менска.

## 22 КАСТРЫЧНІКА

22 кастрычніка 1856 года памёр у выгнанні **Рамуальд Падбярэзскі**, выдавец, публіцыст, краязнаўца і фалькларыст. ¨н нарадзіўся ў Вільні, там ка ж скончыў гімназію, затым вучыўся ў Маскоўскім універсітэце. Доўгі час жыў у Пецярбургу. Выдаваў розныя часопісы і альманахі, але найперш праслявіўся выданнем кнігі Яна Баршчэўскага "Шляхціц Завальня, альбо Фантастычныя апавяданні ў Беларусі". Рамуальд Падбярэзскі з'яўляецца таксама аўтарам цікавых нарысаў па беларускай этнаграфіі, гэткіх, як "Беларускае вяселле", "Антон Абрамовіч, беларускі музыкант" і шмат якіх іншых. Напісаў таксама славутыя "Лісты з Беларусі", што выходзілі ў польскім друку. У 1850 годзе Рамуальда Падбярэзскага за антырасейскую дзейнасць арыштавалі і выслалі ў Архангельскую губерню, дзе ён і памёр 22 кастрычніка.

## 23 КАСТРЫЧНІКА

23 кастрычніка 1834 года нарадзіўся змагар паўстання 1863 – 1864 гадоў на землях Беларусі **Ян Ваньковіч**. ¨н прыйшоў на свет у маёнтку Сляпянка (цяпер гэта тэрыторыя горада Менска). Ян Ваньковіч скончыў лясны інстытут у Пецярбургу і стаў працаваць ляснічым у Белавежскай пушчы. А калі пачалося антырасейскае паўстанне пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага, Ян Ваньковіч узначаліў Берасцейскі паўстанцкі атрад і не раз уступаў у бой з расейскімі войскамі. Пасля разгрому паўстання паўстанец мусіў уцякаць за мяжу. У гэтай справе яму дапамагала Эліза Ажэшка. Усё астатняе жыццё Ваньковіча прайшло ў Парыжы і Кракаве. Дарэчы, Ян Ваньковіч – сын знакамітага беларускага мастака Валенція Ваньковіча (1800 – 1842 гг.)

## 25 КАСТРЫЧНІКА

У гэты дзень 1868 года ў Пецярбургу нарадзіўся **Карл Грыгаровіч**, вядомы беларускі скрыпач і педагог. Ягоныя бацькі паходзілі з Беларусі, таму ён неаднаразова тут гастраляваў. Пачынаючы з 1883 года ён штогод прыязджаў з канцэртамі ў Віцебск. А ў 1918 годзе пераехаў у горад над Дзвіною назаўжды. Тут, у Віцебску, ён быў прафесарам народнай кансерваторыі, часта выступаў у суправаджэнні віцебскага сімфанічнага аркестра, рэгулярна ўдзельнічаў у штотыднёвых вечарынах камернай музыкі, знаёмячы беларускую публіку з найноўшымі здабыткамі заходняй музычнай культуры. Карл Грыгаровіч быў слынным скрыпачом-віртуозам, тонкім інтэрпрэтатарам скрыпічнай і квартэтнай класікі. Памёр выбітны музыка ў 1921 годзе у Віцебску. Заўчасна.

25 кастрычніка 1884 года ў вёсцы Наройкі, што на Падляшшы, нарадзіўся **Сяргей Дубінскі**, славуты беларускі археолаг і гісторык. Перад I Сусветнай вайной ён паспеў скончыць Пецярбургскі універсітэт. З 1924 года працаваў у Менску, быў сябрам гісторыка-археалагічнай камісіі, ад 1928 года працаваў у Інбелкульце. Пазней Сяргей Дубінскі стаў адным з першых супрацоўнікаў Інстытута гісторыі Акадэміі Навук Беларусі. Даследаваў помнікі жалезнага веку і эпохі Сярэднявечча, спачатку ў сябе на радзіме, а затым і ва Усходняй Беларусі. Калі пачаліся бальшавіцкія рэпрэсіі супраць беларускай інтэлігенцыі ў БССР, Сяргей Дубінскі з'ехаў у Ленінград, дзе з 1933 года працаваў у Акадэміі матэрыяльнай культуры. Але не доўга. Там яго арыштавалі і расстралялі 27 жніўня 1937 года.

А 25 кастрычніка 1936 года ў Магілёве нарадзіўся **Віктар Тураў**, слынны беларускі кінарэжысёр. Сваю творчую біяграфію ён пачаў як кінадакументаліст яшчэ ў 1954 годзе. А пазней стаў экранізаваць творы беларускіх пісьменнікаў Алеся Адамовіча, Алеся Петрашкевіча, Івана Мележа. Менавіта экранізацыя мележаўскай "Палескай хронікі" прынесла яму сусветную славу, а таксама Дзяржаўную прэмію СССР. Фільм Турава "Людзі на балоце" атрымаў прызы і прэміі ў Францыі, Італіі і нават на Філіпінах.

## 28 КАСТРЫЧНІКА

28 кастрычніка 1884 года ў Менску нарадзіўся **Фларыян Ждановіч**, адзін з заснавальнікаў беларускага прафесійнага тэатру, акцёр, рэжысёр і грамадскі дзеяч. Тэатральную адукацыю ён атрымаў у Варшаўскай драматычнай школе (1902). З 1917-га па 1920 год быў мастацкім кіраўніком і рэжысёрам Першага беларускага таварыства драмы і камедыі, а ў 1920 годзе пад яго кіраўніцтвам адкрыўся Беларускі дзяржаўны тэатр. Фларыян Ждановіч здзейсніў шмат першых пастановак класікі беларускай драматургіі – Купалы, Коласа, Аляхновіча, Галубка, Каганца. ¨н сам перакладаў на беларускую мову і ставіў на сцэне творы польскай, расейскай і ўкраінскай класікі. Але бальшавікі не далі працаваць яму на ніве беларушчыны. 18 ліпеня 1930 года творца быў незаконна арыштаваны і асуджаны на 5 гадоў папраўча-працоўных работ. У ліпені 1937 года Ждановіч быў арыштаваны ізноў. Абарвалася жыццё яшчэ аднаго беларускага дзеяча. У кастрычніку ўсё таго ж 37-га...

## 29 КАСТРЫЧНІКА



М. Зарэцкі

Сёння ў беларускім календары дзень жалобы. 29 кастрычніка 1937г. бальшавіцкія каты расстралялі выбітных сыноў Беларусі **Алеся Дудара, Анатоля Вольнага, Міхася Зарэцкага, Платона Галавача...** Без каментарыяў.

І яшчэ адна жалобная дата. 29 кастрычніка 1942 года нямецкія нацысты разам з украінскімі паліцыянтамі знішчылі 16 тысяч габрэяў у Пінску. А праз 10 гадоў савецкамаскоўскія ўлады узарвалі тамсама найстарэйшую сінагогу на землях былой Рэчы Паспалітай.



А. Дудар

А яшчэ ў гэты дзень 1989 года ва урочышчы **Купапаты**, што пад Менскам, быў пастаўлены і асвечаны першы крыж. Не толькі у памяць загінуўшых ад рук бальшавікоў у канцы 30-х, але і ў памяць усіх беларусаў, бязвінна закатаваных і забітых захопнікамі ў XX стагоддзі. Светлая памяць.



П. Галавач

## 30 КАСТРЫЧНІКА

30 кастрычніка 1937 года ў Менску працягвалі расстрэлы беларускіх паэтаў. Гэтым разам былі забітыя **Янка Нёманскі, Тодар Кляшторны** і зусім малады **Юлій Таўбін**. Гэта быў апошні групавы расстрэл паэтаў у Менску. Верагодна таму, што іх болей не засталося. Усе, каго не забілі, ужо былі высланыя ў ГУЛАГ.

**Гістарычны сектар**

# ЯН БУЛГАК: «СПЫНІСЯ ІМГНЕННЕ, ТЫ ЦУДОЎНАЕ!»

СЁННЯ МЫ ПРАДСТАЎЛЯЕМ ВАШАЙ УВАЗЕ АСОБУ ЦІКАВУЮ І ШМАТГРАННУЮ. НА ЖАЛЬ, ЯЕ ІМЯ СУЧАСНАЙ МОЛАДЗІ Ў ПЕРАВАЖНАЙ БОЛЬШАСЦІ НЕЗНАЁМАЕ. АЛЕ ЧАЛАВЕКА, ПРА ЯКОГА БУДЗЕ ВЕСЦІСЯ ГАВОРКА, ВАРТА ВЕДАЦЬ У ТВАР. ІТАК, ЯН БУЛГАК – СЛЫННЫ БЕЛАРУСКІ І ПОЛЬСКІ ЭТНОГРАФ І ФАЛЬКЛАРЫСТ, А НАЙПЕРШ – МАЙСТАР МАСТАЦКАЙ КРАЯЗНАЎЧАЙ ФАТАГРАФІІ.

Ян Булгак нарадзіўся 6 кастрычніка 1876 года ў вёсцы Асташына цяперашняга Навагрудскага р-на Гарадзенскай вобласці. Дзякуючы яму, да нашага часу дайшлі выявы людзей, вёсак і гарадоў, а таксама архітэктурных помнікаў краю, якіх даўно няма ў рэчаіснасці. З поўным правам Яна Булгака называюць віленскім фотамайстрам. У 1912 годзе, калі з ініцыятывы Фердынанда Рушчыца Археалагічная камісія гарадской управы Вільні вырашыла стварыць віленскі фотаальбом, альтэрнатывы не было – з вёскі Перасека з-пад Менска быў запрошаны майстар Ян Булгак... ¨н не жыў у былой сталіцы Вялікага княства Літоўскага, але ўлетку і позняй восенню, калі з палёў сабраныя былі апошнія зямныя плады, фатограф наязджаў у Вільню. Сярод тых, з кім ён ладзіў свае першыя шпацыры па гора-дзе, былі Іван Луцкевіч і Фердынанд Рушчыц. Разам з Луцкевічам па панядзелках яны хадзілі ў дом на Зарэччы, над стромкім берагам хуткацечнай порсткай Вілейкі. Тут, у кватэры Рушчыца, збіраўся незвычайны салон – квецень віленскай культуры, жорстка адабраная самім гаспадаром.

... Падчас адной з тых вечарынаў на Зарэччы Ян Булгак і атрымаў замову ад гарадскога галавы Вільні спадара Міхала Венслаўскага стварыць поўны “гарадскі фотаархіў“. Вось тады Булгак ужо на працяглы час перабраўся ў Вільню. “Я мусіў з кансультацыямі Рушчыца, - пісаў ён, - інвентарызаваць усе помнікі віленскай архітэктуры пры дапамозе шэрагаў здымкаў, агульных і фрагментарных, і стварыць з іх альбомы...“



**Фотаздымак беларускай вёскі пачатку XXст.**

У перыяд з 1912 па 1919 год Булгак выканаў некалькі тысячаў здымкаў сакральнай архітэктуры, палацаў, могілак, вуліц і завулкаў Вільні. Для сваіх мастацкіх выправаў ён наўмысна абіраў сонечныя дні, гадзіны першых звонкіх прамянёў і мядовага святла папалудні. Пазней, у 1936 годзе, у сваёй кнізе “Эстэтыка святла“ Булгак напіша: “Архітэктура без сонца – мёртвая і пляскатая...“

Маштабы асобы Яна Булгака з цяжкасцю змяшчаюцца ў нашыя ўяўленні пра тую пару, пра тое фота, пра тое мастацтва. ¨н з’яўляецца заснавальнікам і старшынёй фотаклуба Польшчы, віленскага фотаклуба, саюза польскіх мастакоў-фатографаў, польскага фатаграфічнага таварыства. ¨н аўтар дзясяткаў артыкулаў і шматлікіх кніг, педагог, бібліёграф, фальклярыст, гісторык мастацтваў. Менавіта Булгак — першы беларускі гісторык фатаграфіі. Яму належыць спецыяльная праца “Пра першых віленскіх фатографаў з XIX стагоддзя“, якая выйшла асобнай кнігай у Вільні ў 1939 годзе.

Мастак апублікаваў шмат здымкаў беларускіх краявідаў, вёсак, гаспадарчых пабудоў, беларускіх сялян у этнаграфічных выданнях і часопісах “Ziemia” (“Зямля”), “Kwartalnik Litewski” (“Літоўскі квартальнік”), “Wies ilustrowana” (“Ілюстраваная вёска”) і інш. Найбольш вядомыя з тых фотаздымкаў – “Беларус з-пад Клецка”, “Бабулька-беларуска з маёнтка Перасека пад Менскам”, “Жабракі-беларусы пад Менскам”, “Беларуская дзяўчына з-пад Клецка ў народным убранні”, “Беларуска з-пад Клецка ў народным строі з самаробнага сукна” і інш.

У 1944 годзе каласальны архіў і фотатэка Булгака (звыш 10 тысячаў адзінак) былі панішчаныя полымем савецкай бамбардзіроўкі...

А ў 1950 годзе фатографа не стала. На той момант ён жыў у Варшаве.

**Цяпер, на жаль, большасці гісторыкаў і мастацтвазнаўцаў творы Яна Булгака не даступныя. Многія яго фотаздымкі беларускіх зямель захоўваюцца ў Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы і Цэнтральнай бібліятэцы АН Літвы ў Вільнюсе.**

**Алена ДЗЕМІДЗЮК**

# МУЗЫКАЛЬНАЯ ОСЕНЬ

ЕСЛИ ПОД НОГАМИ ШУРШАТ ЛИСТЬЯ, ЗНАЧИТ НАСТУПИЛА ОСЕНЬ. ЧТО, В ПРИНЦИПЕ, ЛОГИЧНО. А В МУЗЫКЕ ЭТО САМАЯ АКТИВНАЯ ПОРА ГОДА. ПОДТВЕРЖДЕНИЕМ ЭТОМУ СТАЛИ КОНЦЕРТЫ, КАК ИЗ ВЕДРА ПОСЫПАВШИЕСЯ НА БРЕСТЧАН ПОСЛЕ ЛЕТНИХ МЕСЯЦЕВ СВОЕОБРАЗНОГО МУЗЫКАЛЬНОГО «ЗАСТОЯ».

## ПЕРВОКУРСНИКАМ ПОСВЯЩАЕТСЯ

Осенний сезон открыл «Онегин». Наверное, это самая нелюбимая группа в Бресте, имеющая огромное количество поклонников. Отсутствие рекламы по городу не помешало ей собрать актовый зал в старом корпусе БрГУ. Пришли лишь те, кому это было нужно, поэтому все прошло в довольно теплой дружеской обстановке. Несколько вещей из старых хитов вперемешку с песнями из нового альбома были исполнены “на бис” перед студенческой аудиторией. Скромно и со вкусом. Оказалось, каждый год Олег Степанюк (вокалист “Онегина”) и компания проводит такие концерты в честь первокурсников, разумеется бесплатно.




## ЧЕРНЫЙ ПРАЗДНИК

Наверное, самую большую радость принес сентябрь брестским металхэдам. Со времен последнего тяжелого сейшена, когда приезжали «Behemoth», успело пройти уже восемь месяцев. Поэтому 9 сентября у диско-клуба Zio Pepe собралось довольно много разношерстного народа: от широкоштанинных хардкорщиков до вечно мрачных блэкарей. Праздника любителям экстремальной музыки не испортило даже отсутствие хэдлайнеров PUNGENT STENCH. Не приехали и объявленные V.E.L.D., что наталкивает на мысль, что размещение названий этих групп на афишах было хитроумным рекламным ходом организаторов.







Ставшие уже постоянными участниками подобных сейшенов брестчане KNUCKLEDUSTER, не посмотрев, что играют первыми, легко расшевелили весь зал. Под мощный хард-кор гомельской RASTA всех плющило и колбасило, а «добили» всех россияне из коллектива GRENOUER. Их кавер на бессмертное творение Кавальерро «Bloody Roots» стал «контрольным выстрелом». В состоянии легкой эйфории металлеры неохотно покидали стены ставшего уже родным клуба. Даже на лицах тру-энд-ивл незаметно проглядывала улыбка.

## СЕНЯБРЬ НА ВОЛЫНКЕ

За что мне нравится Волынка, так это за ее микроклимат. Да, пускай далеко, пускай неудобно, но все-таки не так уж и плохо, что рок-клуб закинули в пригород. Концерты тут отличаются какой-то теплой и дружеской обстановкой. В одно такое прекрасное воскресенье тут и прошел «Рок-сентябрь», который планируется проводить ежегодно.

МНОГОТОЧИЕ, NAD SMILE, TRANSFUSION BLOOD, BLACK TIME, ПТЕРОТРИО (Брест), БЕЗ НАЗВАНИЯ (Береза), PITERS TACKERS & STN (Белоозерск). Практически у каждой команды оказалось достаточно поклонников. Радовало разнообразие стилей: от веселого калифорнийского панка до тяжелого грайнд-кора. Этот концерт стал, по словам Кирилла Курбатского, президента рок клуба, альтернативой грядущей «Золотой осени», проведение которой, кстати, поручили БРСМ. Интересно, а рок-клуб у нас в городе будет макулатуру собирать?

**Денис ДЕНИСОВ**

**Фото: zukk@tut.by**

# ЧАЛАВЕЦТВА Ў ПАВУЦІННІ КІБЕРПАНКУ

АМАЛЬ ТРЫ ГАДЫ НАЗАД ЧАЛАВЕЦТВА ЗРАБІЛА КРОК У ТРЭЦЯЕ ТЫСЯЧАГОДДЗЕ – ТЫСЯЧАГОДДЗЕ ЛІЧБАЎ І КАМПУТАРАЎ. РАЗАМ СА СПАДЧЫНАЙ ШЭКСПІРА, ПУШКІНА, КАРАТКЕВІЧА Ў НОВЫМ ТЫСЯЧАГОДДЗІ АПЫНУЛІСЯ КІСЛОТНІКІ, ПАНКІ, БАЙКЕРЫ І ЎСЯ АСТАТНЯЯ МОЛАДЗЬ, АЛЕ ДА АКТЫЎНЫХ ПЛЫНЯЎ МІНУЛАГА ДАЛУЧЫЛАСЯ НОВАЯ З'ЯВА, НАЗВА ЯКОЙ КІБЕРПАНК.

Раскладзіце назву на састаўныя часткі і ўсе стане зразумелым: кібернетычны панк. Дзіца новага часу. Па-першае, трэба сказаць, што гэта напрамак літаратуры.

Гэтую назву ў лексікон увёў Брус Бэтк (Bruce Bethke), які ў 1980 годзе выдаў навэлу пад назвай "Кіберпанк". Але гэты твор не атрымаў папулярнасці, і асобай, якая дала жыццё гэтаму тэрміну – як бывае найчасцей – па праву можна лічыць журналіста Гарднэра Дозаіса (Gardner Dozois).

У пачатку 80-х гадоў Брус Сцерлінг (Bruce Sterling) разам з калегамі па спецыяльнасці (Левіс Шынар і Рудзі Ракер) выдаваў аднастаронкавую газету "Танная праўда" (Cheap Truth), у якой ананімна крытыкаваў стан сучаснай навукова-фантастычнай літаратуры і бессаромна захвальваў свае працы. Якія? Зразумела, кіберпанкавыя. А сабе яны далі мянушку "Рух" (The Movement).

Але, як мне здаецца, кіберпанкавы рух рушыў з (храмаванага) капыта дзякуючы аповесці Вілляма Гібсана (William Gibson) – "Неўрамансэр" ("Neuromanser"). Самым фантастычным у гэтай кніжцы з'яўляецца тое, што аўтар выдаў яе ў 1984 годзе, калі Сецьне мела сучасных памераў, не было хакераў, віртуальнай рэчаіснасці, ці, як яе яшчэ называюць, кіберпанкавай прасторы. З гэтага пункту гледжання яго (Гібсана) можна назваць прадказальнікам, а па-за гэтым і дасканалым пісьменнікам.



Рэальнасць аповесці Гібсана – гэта недалёкае будучае, якое выглядае не вельмі прывабна. Свет "Неўрамансэра" пачынаецца так "... неба мела колер экрану настроенага на мёртвы канал... Пост-кампутары, вірусы і сродкі праграмавання як наймацнейшая зброя, мутацыі і трансфармацыі чалавечага цела і розуму пры дапамозе імплантантаў, пратэзаў, кланавання..."

Добра – "Кібер" ужо разабралі, а як з "панкам"? Лагічна аднесці новы панк да тлумачэння гэтага выразу ў 30-х гадах. Тады ён азначаў крыміналіста, асобу са свету закавулкаў, падвалаў.

У кіберпанкавых аповесцях простыя смяротныя не маюць доступ да тэхналогіі: яна збыт моцная і уладанне ёю тоесна уладанню над светам, ці, у крайнім выпадку, бяспецы і грошам. Калі чалавек з гарадскіх джунгляў жадае захаваць вольнасць і незалежнасць – ён павінен карыстацца нелегальнымі шляхамі інфармацыі, сродкамі праграмавання, кібернетычнымі вынаходніцтвамі і Сеткай. Па-за гэтым ёсць ужо эліта і натоўп, прымоўлены да анігіляцыі. І ёсць абавязкова галоўная дзеючая асоба, тэхналагічны анархіст, ён ці вядзе барацьбу з "Сістэмай" у імя якой-небудзь ідэі, ці, найчасцей, не жадае пераўтварацца ў паўробата, машыну, нуль.



Ну вось, дайшла чарга да і да спісу літаратуры. Калі добра пастарацца, то можна знайсці творы Гібсана, такія, як "Неўрамансэр" і яго працяг "Граф Зеро", "Мона Ліза Турба", а таксама зборнік апавяданняў "Джоні Мнемонік"; "Віртуальнае святло", "Святы агонь" Сцерлінга.

Да першых кіберпанкавых фільмаў адносяць: "Бягучы па лязу" (Blade Runner), адсняты на падставе аповесці Філа К. Дзіка. Пазней з'явіўся "Джоні Мнемонік", яшчэ былі "Вайна Тэка", "Вышыня Макса". А таксама "Тэрмінатар", "Поўны выбар" і, зразумела, "Матрыца".

Той факт, што кіберпанк прадстаўляе недалёкую будучыню, прывёў да таго, што шмат людзей стала атаясамлівіць сябе з героямі Гібсана і Сцерлінга.

Менавіта таму пад кіберпанкамі пачалі разумець хакераў (знаўцы Сеткі і сродкаў праграмавання), прыкераў (што нелегальна карыстаюцца з іншай глабальнай Сеці), кіберпанкаў (людзі, якія вераць у захаванне прыватнасці Сеткі), нарэшце людзей, што гуляюць у "кіберпанкавыя" гульні. З'явіўся таксама і слэнг, які прадстаўляе сабою мешаніну тэрмінаў з кіберпанкавых кніг, мовы праграмавання і да т. п.

Кіберпанк – гэта рака і мора. Зараз я змог зрабіць толькі падмурак для гэтай тэмы. А хаця колькі ўжо напісана кніг аб тым, што такое кіберпанк, і амаль няма ніводнай кіберпанкавай кнігі!

**ICE**

**P.S.**

Жанчына запытвае ў тэрапеўта:

- Доктар, мой 17-гадова сын так захапіўся кампутарам, што нават спіць ля манітора. Парайце, як яго адвучыць?

- Вельмі проста! Віно, гарэлка, цыгарэты, жанчыны...

# НЕОЖИДАННОСТЬ. НЕ ДЕТСКАЯ!

Совсем недавно, попав на один из информационных сайтов, был поражен печальной информацией:

60 % жителей нашей Республики НЕ УМЕЮТ работать на компьютере, т. е., как это не покажется логично, процентов, эдак, 40 умеют.

Но и это еще не всё. Доступ в интернет имеют лишь 27% респондентов. Большинство же граждан, а это 63%, не имеют доступа во всемирную сеть. САМОЕ ИНТЕРЕСНОЕ, что 10% опрошенных даже не знали, **ЧТО ЭТО ТАКОЕ**!



Если интересно, то еще немного статистики: каждый десятый (10%) из респондентов, имеющих доступ в интернет, пользуется им ежедневно, 22% - несколько раз в неделю, 29% - несколько раз в месяц. Остальные 39% опрошен- ных жителей Беларуси пользуется интернетом реже одного раза в месяц.

А сейчас прошу сильно не разочаровываться в нашем «информационном» обществе, т. к. было опрошено только около полутора тысяч граждан республики 16-ти лет и старше.

Будем надеяться, что более информационную часть нашего общества этот соц. опрос не затронул.

**Николай РУЦКИЙ.**

## ДАРЭЧЫ

Званок на радыё:

- Пастаўце, калі ласка, песню Пугачовай пра тое, як у яе завіс Windows!

Ды-джэй (пасля паўзы):

- Я не магу ўспомніць у Пугачовай такую песню! Зможаце напець?

- ну, там яшчэ ў рэфрэне: "Кликну, а в ответ тишина, снова я осталась одна..."



*Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі! (Ф. Багушэвіч)*

# НАРОДНЫ КАЛЯНДАР – ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСАЎ

ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ! МЫ РАСПРАЦАВАЛІ ДЛЯ ВАС НЕЗВЫЧАЙНУЮ І ВЕЛЬМІ ЦІКАВУЮ РУБРЫКУ, ЯКАЯ ДАЗВОЛІЦЬ ВАМ ЗАЗІРНУЦЬ У СВЯШЧЭННЫЯ ТАЙНЫ ТРАДЫЦЫЙНАЙ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ. У ЁЙ МЫ ІМКНУЛІСЯ ПАСПРАБАВАЦЬ ПЕРАКІНУЦЬ НАДЗЕЙНЫ МАСТОК У ДЗЕНЬ СЁНЯШНІ, КАБ ПАТЛУМАЧЫЦЬ СУЧАСНІКАМ-СУАЙЧЫННІКАМ, ШТО БЕЗ ГЛЫБОКАГА ВЕДАННЯ СВАІХ КАРАНЁЎ І ВЫТОКАЎ МЫ НЕ ЗРАЗУМЕЕМ АСАБЛІВАСЦЯЎ НАШАГА СВЕТАЎСПРЫМАННЯ І СВЕТААДЧУВАННЯ І НЕ ЗМОЖАМ АСЭНСАВАЦЬ СВАЁ МЕСЦА Ў СЁННЯШНІМ ДНІ І Ў БУДУЧЫНІ.

У гэтым нумары мы распавядзем Вам аб асаблівасцях утварэння Беларускага народнага календара, успомнім асноўныя традыцыі Беларусаў.

Трэба адзначыць, што наш цяперашні каляндар і адпаведныя нормы святкаванняў відавочна грунтуюцца на спалучэнні традыцый і абрадаў розных эпох, веравызнанняў і нават культур іншых народнасцяў. Давайце паспрабуем вылучыць з іх спрадвечна Беларускія ў адпаведнасці са шляхамі і асноўнымі вехамі фарміравання Беларускага народнага календара (БНК).

Кропкай адліку для нас будуць Каляды.



Маленькі калядоўшчык. Фота: С.Бахун

Іх святкаванне да прыходу на Беларусь хрысціянства распачыналася ў момант зімовага сонцавароту - у ноч з 24 на 25 снежня ( у адпаведнасці з юліянскай сыстэмай летазлічэння ).

Па хрысціянскай традыцыі святкаванне Новага Года было прымеркавана да нараджэння Збавіцеля, і асноўныя абрады праходзілі з 31-га снежня па 1-га студзеня. Але ж у гадавым колазвароце жыцця праваслаўнага верніка Калядам і Раству Хрыстову папярэднічае шасцітыднёвы Піліпаўскі пост. Атрымліваецца, што Новы год трапляе на заключную, самую строгую ў рытуальным плане частку, якая вымагае стрыманасці паводзін і строгіх абмежаванняў у ежы. З гэтага вынікае, што святочны навагодні стол мусіць быць посным.Зразумела, што народ знайшоў выйсце з гэтага становішча. Заканчэнне посту плаўна пераходзіла ў калядныя святкаванні, якія распачынала першая Куцця. Яна мела пераходны, прамежкавы характар, таму называлася “посная”. А вось ужо другая Куцця якую з”ядналі з Новым годам, атрымала назву Шчадрэц і праводзілася па ўсіх канонах беларускай гасціннасці і ветлівасці.

Такі прынцып святкаванняў захоўваўся да прыходу на Беларусь савецкай улады, пасля чаго Новы год стаў адзначацца у адпаведнасці з новым стылем, а пра Раство Хрыстова(як і пра ўсе хрысціянскія святы) амаль прымусілі забыць...

Другім па значнасці народным святам было Купалле, якое ў гадавым часавароце аказвалася супрацьлеглым адносна Каляд і прыпадала на дзень летняга сонцавароту (24-25 чэрвеня).Гэта поўнасцю адпавядала прынцыпу будавання БНК на аснове касмічнай прымеркаванасці, якая была характэрна, дарэчы, розным этналагічным культурам.Не дзіва, што і ў хрысціянскай рэлігіі знайшоўся значны адпаведнік - свята ў гонар Івана (Яна ) Хрысціцеля.

Зараз, дзень святога Іаана Хрысціцеля (як і само “афіцыйнае” Купалле ) адзначаецца на два тыдні пазней за першапачатковую дату.



Святкаванне Купалля на Святым возеры ў Магілёве ўвечары 6 ліпеня 2001г. Фота: IREX/ProMedia

Лагічна меркаваць,што і дзве прамежкавыя падзеі вызначальнага характару ў касмічным сонцазвароце не маглі не адзначацца пэўнай абрадава-ідэалагічнай прымеркаванасцю.Мы маем на ўвазе дні вясновага і восеньскага раўнадзенства.З першым з іх супадала святкаванне Вялікадня і, магчыма, галоўнага свята ў гонар славянскага бога Сонца - Ярылы.- Параўнанне беларускага Ярылы з нямецкім



Святкаванне Купалля на Святым возеры ў Магілёве ўвечары 6 ліпеня 2001г. Фота: IREX/ProMedia

Jahr і ангельскім year, а таксама шэраг іншых акалічнасцяў, наводзіць на думку аб тым, што менавіта дзень вясновага раўнадзенства (21-22 сакавіка) быў некалі старажытным пачаткам года ў нашых продкаў.На яго прыпала і вызначальнае хрысціянскае свята - Пасха (Васкрашэнне Хрыстова), якое, праўда, па ўласнахрысціянскіх канонах не мае пэўнай даты.

Дню асенняга раўнадзенства адпавядала свята ў гонар заканчэння збору ўраджаю – Багач. У гэты дзень у многіх мясцінах Беларусі ладзілі кірмашы, выконвалі рытуал абносу свечкай усёй вёскі і “вечны агонь“, які гарэў у двары з дня вясновага раўнадзенства, уносілі ў хату. Хрысціянскі адпаведнік гэтаму святу- Раство Багародзіцы.

Такім чынам, мы адзначылі ўжо 4 фазы у руху Сонца па небасхіле і 4 святы, прымеркаваныя да гэтых падзей.

На гэтым мы скончым наш сёняшні агляд беларускіх традыцыйных святаў.У наступных нумарах мы працягнем гэтую тэму, а таксама павядзем размову аб іншых акалічнасцях светаўспрымання нашых продкаў і прадаставім Вам яшчэ шмат цікавай інфармацыі.

**В.К. А.К.**
**(Наш СвоД)**

**Артыкул напісаны паводле прац доктара філалагічных навук Янкі Крука, змешчаных у кнізе “Сімволіка Беларускай Народнай Культуры”.**

## АБ‘ЯВЫ

**Рэдакцыя бюлетэня “Дзедзіч” шукае распаўсюджвальнікаў выдання ў навучальных установах Берасця і вобласці. Тэл. (0162) 22-90-97.**

**Рэдакцыя бюлетэня «Дзедзіч» запрашае да супрацоўніцтва карэспандэнтаў з Берасця і гарадоў вобласці. Калі вы жадаеце выказаць свае думкі на нашых старонках, тэлефануйце: (0162) 22-90-97.**



АБ'ЯВЫ

# ЛЕТНІ УНІВЕРСІТЭТ У БУДАПЕШЦЕ

Летні універсітэт Summer University (SUN) (Будапешт, Венгрыя) прапануе спецыялістам, даследчыкам, выкладчыкам і супрацоўнікам ВНУ навучанне на кароткатэрміновых курсах па актуальных напрамках сацыяльных навук і адміністравання ў сферы вышэйшай адукацыі.

Навучанне праводзіцца з мэтай садзейнічання ва ўсталяванні рэгіянальных і міжнародных кантактаў, а таксама ў ажыццяўленні ўзаемнага абмену ў галіне гуманітарнай адукацыі і навукі паміж вучонымі Цэнтральна- і Усходне-Еўрапейскага рэгіёну, Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі.

Летам 2003 года прапануецца 17 курсаў па наступных дысцыплінах:

- мастацтва і культуралогія; антрапалогія; эканоміка; навукі аб навакольным асяроддзі; гісторыя; правы чалавека; міжнародныя адносіны; права; медыявістыка; пытанні нацыяналізму; філасофія; публічная палітыка; рэлігіязнаўства; сацыялогія.

Удзельнікам аплачваюцца выдаткі, звязаныя з паездкай і ўдзелам у праграме.

Працоўная мова - ангельская. Кандыдатам неабходна ведаць ангельскую мову ў аб'ёме, дастатковым для актыўнага ўдзелу ў занятках і дыскусіях.

Заявы прымаюцца офісам універсітэта да 15 студзеня 2003 года.

Больш падрабязная інфармацыя і аплікацыйныя формы: http://www.ceu.hu/sun/sunindx.html; CEU-Summer University Office; 1051 Budapest, Zrinyi u. 14. Hungary.

Tel.: (36-1) 327-3811, Fax: (36-1) 327-3124.

E-mail: summeru@ceu.hu (for information and general correspondence), (for requesting application forms).

**Dzedzich week-news**

# КОНКУРС НА ПРАДАСТАЎЛЕННЕ ГРАНТАЎ

## NONPROFIT SECTOR RESEARCH FUND, ESPIN INSTITUTE

Nonprofit Sector Research Fund, Espin Institute абвяшчаюць конкурс на прадстаўленне грантаў у падтрымку даследаванняў некамерцыйнага сектару: дабрачынных і гуманітарных установаў, шпіталяў, універсітэтаў, арганізацыяў мастацтва, праваабарончых групаў і іншых непрыбытковых структураў.

Прымаюцца заяўкі даследчыкаў, якія ўжо займаюцца даследаваннем некамерцыйнага сектару. Таксама вітаюцца звароты ад спецыялістаў у галіне акадэмічных дысцыплінаў (эканоміка, права, палітычныя навукі, сацыялогія, грамадская палітыка, гісторыя, кіраванне і інш.), для якіх даследаванне некамерцыйнага сектару будзе новай справай. У дадзены момант прымаюцца заяўкі на падтрымку ў наступных галінах:

- непрыбытковая дзейнасць, грамадская палітыка, уключаючы вывучэнне наступстваў падтрымкі дзяржавай некамерцыйных арганізацыяў, прыватызацыі, працоўных адносінаў у непрыбытковым сектары;
- фонды, уключаючы вывучэнне заснавання, кіравання фондамі, стратэгіі іх дзейнасці;
- дысертацыйныя даследаванні, скіраваныя на вывучэнне ўсіх аспектаў некамерцыйнай і дабрачыннай дзейнасці ў ЗША і іншых краінах.

Дадатковая інфармацыя: Тэл. (202) 736 58 00; Адрас у Інтэрнэт: www.iapps.com, www.nonprofitresearch.org, nstf@aspeninstitute.org.

# ПРАГРАМЫ АД IREX

У рамках праграмы «Актуальныя пытанні сучаснасці» спецыялістам з краін СНД, у тым ліку Беларусі, даецца магчымасць правесці сацыяльна-палітычныя даследаванні ў ЗША на працягу чатырох месяцаў. Да ўдзелу запрашаюцца эканамісты, дзяржаўныя служачыя, юрысты, палітычныя аналітыкі, спецыялісты ў галіне сістэмы аховы здароўя, дзеячы НДА, журналісты і інш. Усе заявы павінны змяшчаць распрацаваныя і мэтанакіраваныя даследчыцкія праекты, што маюць палітычнае значэнне і прыдатныя для практычнага выканання ў Расіі ці іншых краінах Еўразіі. Праекты павінны адносіцца да адной з наступных катэгорыяў: бізнэс; праблемы грамадзянскай адказнасці; умацаванне заканадаўства; рэфармаванне сістэмы адукацыі; пытанні мілітарызацыі і бяспекі; развіццё і кіраванне НДА; праблемы сацыяльных рэформаў; ахова навакольнага асяроддзя; пытанні аховы здароўя; журналістыка і СМІ; эканоміка; энергетыка; паліталогія; Інтэрнэт; правы чалавека; захаванне законнасці; дзяржаўнае кіраванне; міжнародныя адносіны. Арганізатары забяспечваюць транспартныя выдаткі ў абодва бакі, аплату жылля, сродкі на прафесійнае развіццё, частковую медыцынскую страхоўку. Апошні дзень падачы заяваў - 22 лістапада 2002г.

За больш падрабязнай інфармацыяй адносна праграм звяртайцеся на адрас: вул. Варвашэні, 73, пав. 5, Менск, 220005; тэл.: (017) 283-14-07, 283-14-08; e-mail: galina@irex.by, oksana@irex.by.

# КРОЧЫМ НАПЕРАД З МУЗЫКАЙ

Падрыхтоўку да II рок-фэсту Палескага рэгіёна "Крок" распачала МА "Абракадабра" (Кобрын). Яго правядзенне плануецца на пачатак вясны. Як і ў мінулым годзе, сябры МА спадзяюцца на дзейсную падтрымку Аддзела культуры Кобрынскага райвыканкама.

Па словах старшыні МА "Абракадабра" Ягора Вяршылы, сябры арганізацыі прыкладуць усе намаганні, каб вывесці фестываль на еўрапейскі ўзровень. Плануецца, што другі рок-фэст, у адрозненне ад першага, будзе праходзіць на адкрытай пляцоўцы, будзе праводзіцца таксама адбор удзельнікаў (нагадаем, што ў першым рок-фэсце ўзялі ўдзел 11 музычных гуртоў з Палескага рэгіёна). Плануецца запрасіць гурты з суседніх Польшчы і Украіны. "Мы запрашаем да ўдзелу ўсіх зацікаўленых, тых, хто хоча бачыць у сваім рэгіёне якасны фестываль музыкі," – заявіў лідэр моладзевай арганізацыі.

E-mail: kobrin_abra@rambler.ru

**Dzedzich week-news**

*АБ'ЕКТЫЎНА*
*ПРА РЭАЛЬНАЕ*
**RR**
**РАДЫЁ РАЦЫЯ**
***НА КАРОТКІХ ХВАЛЯХ***
*6035 кГц (49 м) 08:00-10:00*
*6180 кГц (49 м) 13:00-15:00*
*6050 кГц (49 м) 21:00-23:00*
***НА СЯРЭДНІХ ХВАЛЯХ***
*612 кГц (490 м) 07:00-11:00*
**WWW.RACYJA.PL**

Берасцейскае абласное аддзяленне
**Грамадскага аб'яднання**
**ПРАВААБАРОНЧЫ ЦЭНТР**
**«ВЯСНА»**
прапануе грамадзянам бясплатную прававую дапамогу.
(адміністратыўнае і грамадзянскае права, парушэнні правоў чалавека)
**Звяртайцеся на адрас:** г. Берасце, бульвар Шаўчэнкі, д. 7, кв. 24.
Тэл./факс: (0162) 20-13-95.

**БЕЛАРУСКАЯ ПАЛІЧКА ЗАПРАШАЕ**
**Сябры! Запрашаем Вас наведаць буйнейшую беларускую электронную бібліятэку! Адрас "беларускай палічкі": www.knihi.com.**
Тут Вы знойдзеце творы беларускіх пісьменнікаў, паэзію, казкі, пераклады вядомых сусветных літаратараў, рэлігійную і філасофскую літаратуру, гістарычныя даследаванні і шмат іншага. Наведвайце нашую віртуальную бібліятэку часцей – мы абнаўляемся штодзённа.
**Усе пажаданні і прапановы чытачоў улічваюцца!**

**ШАНОЎНЫ ЧЫТАЧ!**

**Каб зрабіць наш бюлетэнь больш цікавым і прывабным для цябе і тваіх сяброў, мы звяртаемся да цябе з просьбай адказаць на гэтае пытанне і даслаць адказ на адрас: 224000, г. Берасце, вул. Жураўліная, д. 20, кв.2.**

Будзем вельмі ўдзячныя за тваю дапамогу ў стварэнні цікавай сучаснай газеты, а для лянівых паведамляем, што сярод тых, хто дашле нам свае заўвагі, мы разыграем 3 аўдыёкасеты з музыкай беларускіх гуртоў.

Чаго не хапае на старонках "Дзедзіча", якую інфармацыю ты хацеў бы атрымліваць праз яго:

**УВАГА!**

Працягваецца бясплатная падпіска
**на Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь "Дзедзіч".**

Калі ты жадаеш атрымоўваць яго больш стала і аператыўна, запоўні гэты купон і дашлі яго на адрас:
**224000, г.Берасце, вул. Жураўліная, д. 20, кв. 2.**

Чаму ты вырашыў падпісацца:

Прозвішча:

Імя:

Імя па бацьку:

Паштовы адрас:

Тэлефон:

# ПИКНИКИ НА МУСОРКАХ

КАЖДЫЙ ИЗ НАС, ВОЗМОЖНО, НЕОДНОКРАТНО НАБЛЮДАЛ, ОСОБЕННО ОСЕНЬЮ, КУЧИ ПОЛИЭТИЛЕНОВОЙ ПЛЕНКИ, БИТОГО СТЕКЛА, БАНОК ОТ КРАСКИ, СТРОИТЕЛЬНЫХ И СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННЫХ ОТХОДОВ В ЛЕСАХ И ОКОЛО ДОРОГ ВБЛИЗИ ДАЧНЫХ ПОСЕЛКОВ. МУСОР ЭТОТ ЛЕЖИТ ЗДЕСЬ ГОДАМИ. ОН ПРИНОСИТ ОГРОМНЫЙ ВРЕД ОКРУЖАЮЩЕЙ СРЕДЕ. В ТАКИХ МЕСТАХ НЕ ТО ЧТО ГРИБЫ И ЯГОДЫ НЕВОЗМОЖНО СОБИРАТЬ, А ДАЖЕ ХОДИТЬ ОПАСНО.



К сожалению, несмотря на сильную загрязнённость лесов твердыми бытовыми отходами, я не слышал, чтобы кто-то нёс за это наказание. Создается впечатление, что службу лесной охраны эта проблема не волнует. Хотя, согласно законодательству службы охраны природы, предусмотрена ответственность за такие случаи. Но кто это контролирует?

Среди людей, которых волнует судьба наших лесов и водоемов, есть три категории. Те, которые относятся к первой, просто убирают мусор, поскольку душа болит видеть, как все загажено. Вторые почему-то стесняются это делать на глазах у других. Третьи и хотели бы убрать за собой, но не знают, куда деть мусор, потому что рядом для него нет мусорок. Правда, работники лесхоза собраный мусор периодически вывозят. Только работают они тут не каждый день.

Кстати, работники автоинспекции постоянно контролируют зону отдыха, штрафуют автолюбителей-нарушителей. В пожароопасные периоды налагаются взыскания за разведение костров. А вот за оставленный мусор никто не несет ответственности. На мой взгляд, при небольшой реорганизации систем отдыха можно легко контролировать загрязнение территории. Тогда придется отвечать за свои поступки.

Люди, которые оставляют твердые бытовые отходы на месте своего отдыха, вредят сегодня не только другим жителям и природе, но и тем, кто будет жить после нас. Всем известно, что вторичная переработка мусора способствует сохранению окружающей среды. Когда-то на обложках книг писали: «60 кг макулатуры помогают сохранить от вырубки одно дерево». Существующие в начале 90-х годов масштабы сбора макулатуры позволяли не вырубать дополнительно 75 тыс. гектаров лесных массивов. Притом, при производстве бумаги и картона из такого сырья выбросы в атмосферу снижаются на 85 процентов, а загрязнение окружающей среды - на 40 процентов в сравнении с использованием для этой цели древесины.

Подлежат переработке и пластиковые бутылки, и старые резиновые колеса, которых много валяется около дорог. Правда, водители часто сами сжигают шины, чем вызывают существенные загрязнения атмосферы. В то же время и пластмассу, и резину можно использовать повторно, в част-ности для производства гидротермоизоляционных блоков, облицовочных материалов. В СССР даже была разработана технология получения олова из использованных консервных банок.

Мы сами загрязняем природу, а потом почему-то жалуемся, что везде появляются свалки. В связи с этим нам в пример ставят страны Балтии и Германии, где в лесах, около дорог и селений очень чисто. Да, мне приходилось это видеть. Но там живут такие же, как и мы, люди. Только почему они бережно относятся к природе, а мы - нет? Видимо, все зависит от воспитания. В той же Германии «мусорообразовательные» программы уже укореняются полстолетия. В странах Балтии еще в годы СССР людей приучали беречь природу. А вот в Беларуси почему-то этого не сделали, хотя и образование у нас хорошее, и программ по охране природы достаточно.

Давайте же осознаем тот факт, что мы сами уничтожаем красоту своей земли. Какие же мы хозяева? Наверное, всем необходимо об этом задуматься. И тогда, я верю, мы перестанем оставлять после себя груды мусора в лесах, на берегах водоемов. Прислушайтесь и сердцем к призыву, который звучит по национальному радио: «Дорогие соотечественники! Не засоряйте поля и леса. Уважайте и берегите родную природу!»

**Леонид ЧУМАКОВ,**
**кандидат биологических наук,**
**руководитель секции «Экология и краеведение» научного сообщества учащихся «Даследчык» Республиканского экологического центра учащихся.**



Нашых шаноўных сябровак
Вольгу Крывалевіч (27.09.),
Ганну Маршанюк (07.10.),
Вольгу Шэўкунову (07.10.),
Алесю Сечкарук (09.11.)
віншуем з Днём нараджэння.

**Мы Вас любім!**

**Б/П-III, філфак**



Самага вясёлага супрацоўніка нашай рэдакцыі, добрага сябра і проста цудоўнага хлопца, студэнта II курса юрфака БрДУ МАКСА СЕЛЯГІНА з Днём нараджэння!

**Твой «Дзедзіч»**

## ДАРЭЧЫ

Муж з жонкай ужо якую ноч сняць асобна з прычыны таго, што жонка на восьмым месяцы цяжарнасці. Бачачы, як пакутуе муж, яна яму кажа:

- Дарагі, я выдатна разумею, што ты мужчына, я бачу, як ты пакутуеш, але так як я сама зараз не магу цябе задаволіць па зразумелых прычынах – вось табе 30 даляраў, ідзі да суседкі, яна будзе радая заняцца з табой сэксам. Але гэта толькі ў першы і апошні раз! Я згодная на гэта толькі таму, што вельмі цябе кахаю...

Муж, не верачы сваім вушам, бярэ грошы і, пакуль жонка не перадумала, хуценька ідзе да суседкі. Аднак ужо праз некалькі хвілін ён вяртаецца і кажа жонцы:

- За 30 даляраў яна не згодная, хоча 50.

- Вось ёлы-палы! А калі яна сама была цяжарная, я з яе мужа 30 узяла!

- Мама, а ці можа дзяўчына ў 15 гадоў быць цяжарнай?

- О так!

- О не!...

***

Дзяўчына кажа хлопцу:

– Давай пагуляем у хаванкі. Калі ты мяне знойдзеш – я твая, а калі не – я буду за шафай.

***

Хлопец з дзяўчынай.

- Мань, давай дапамагу, торбу паднясу...

- Не дам!

- Не даш?

- Торбу - не!

***

Што можна сказаць пра жаночы розум?

Мяркуйце самі - няўжо Вы палезлі б з рознымі дурнымі пытаннямі пра колер зубоў, сустрэўшы такі цуд прыроды, як бабёр, штоў мее размаўляць?

***

- Як прымусіць жанчыну замаўчаць?

- Спытаць, пра што яна думае!

№5 ДЗЕДЗІЧ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
кастрычнік 2002

ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ
Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі

СКЛАДАЕМ ПАДЗЯКУ ФОНДУ "НАША ВЕЖА" ЗА АКАЗАНУЮ ДАПАМОГУ

**Заснавальнік:** Ініцыятыўная група моладзі
**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах унутранага карыстання
**Падпісана ў друк:** 14.11.2002 у 18[00]
**Наклад:** 299 асобнікаў.

**Галоўны рэдактар:** Аляксей Краквін
**Рэдакцыйная калегія:** Д.Шыманскі, А.Дземідзюк, М.Селягін, Д.Дзянісаў А.Верамчук, У.Чаберкус
**Вёрстка:** А.Ляўчук

**Кантактны тэлефон:** (0162) 22-90-97
**E-mail:** dzedzich@mail.ru